**Х Р О Н І К А**

### *«Надзённыя праблемы лексікалогіі і анамастыкі славянскіх моў»*

У II Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Надзённыя праблемы лексікалогіі і анамастыкі славянскіх моў» (арганізатары: кафедры беларускага моваЗнаўства, беларускай мовы, рускай мовы), якая адбылася 22–23 красавіка 2010 года, прынялі ўдзел звыш 150 вучоных з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Кітая, што сведчыць пра яе змястоўнасць і актуальнасць. Пра навуковую значнасць акрэсленай праблематыкі гаворыць і склад удзельнікаў канферэнцыі. Гэта супрацоўнікі навукова-даследчых устаноў, навукоўцы ВНУ, навуковыя супрацоўнікі бібліятэк, настаўнікі школ, аспіранты, магістры і магістранты, студэнты. Былі падрыхтаваны і абмеркаваны сумесныя даклады магістрантаў, студэнтаў і іх навуковых кіраўнікоў. Звыш 50 удзельнікаў канферэнцыі з’яўляюцца дактарамі і кандыдатамі навук. Праведзеная канферэнцыя паказала, што навуковыя інтарэсы кафедры, даследчыцкі патэнцыял яе калектыву прызнаны ў навуковай прасторы рэспублікі.

Канферэнцыю адкрыў прывітальным словам рэктар Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя І. П. Шамякіна, доктар біялагічных навук, прафесар В. В. Валетаў, які адзначыў, што правядзенне такога навуковага мерапрыемства на філалагічным факультэце становіцца добрай традыцыяй і дапамагае вучоным розных краін прадставіць і абмеркаваць свае навуковыя дасягненні ў галіне лексікалогіі і анамастыкі. Прадстаўнічым у навуковым сэнсе атрымалася пленарнае пасяджэнне, дзе з грунтоўнымі дакладамі выступілі д. ф. н., прафесар Г. М. Мезенка, (Беларусь, Віцебск), д. ф. н., прафесар В. І. Сянкевіч (Польшча, Седльцы), д. ф. н., прафесар У. І. Коваль (Беларусь, Гомель), д. ф. н., прафесар В. В. Шур (Беларусь, Мазыр), д. ф. н., дацэнт В. Р. Ніканава (Украіна, Днепрапятроўск), к. ф. н., дацэнт Дз. Ю. Ільін (Расія, Валгаград). Апрача пленарнага пасяджэння, на якім абмяркоўваліся канцэптуальныя пытанні славянскай лексікалогіі і анамастыкі, працавала 8 секцый: «Гістарычныя асаблівасці функцыянавання і развіцця лексікі», «Напрамкі сучасных даследаванняў лексікі фальклору і народна-дыялектнай мовы», «Аказіянальная лексіка: умовы, заканамернасці, магчымасці ўтварэння і ўжывання», «Стылістычныя рэсурсы лексікі мастацкай літаратуры», «Анамастыка як моўна-культуралагічны феномен», «Варыянтнасць і праблема ўнармавання навуковай тэрміналогіі», «Лексіка і моўная асоба», «Праблемы выкладання лексікалогіі і анамастыкі ў школе і вну».



МГПУ им. И.П. Шамякина



У рабоце канферэнцыі бралі ўдзел прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь, у прыватнасці, былі прадстаўлены такія навуковыя цэнтры і вышэйшыя навучальныя ўстановы, як Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы НАН Беларусі, БДУ, БДПУ імя М. Танка, БДТУ, МДЛУ, БДСА, Нац. гіст. архіў Беларусі, ВДУ імя П. М. Машэрава, БрДУ імя А. С. Пушкіна, ГрДУ імя Я. Купалы, ГДУ імя Ф. Скарыны, ГДТУ імя П. В. Сухога, МагДУ імя А. А. Куляшова, БарДУ, Валгаградскі дзярж. ун-т, Самарскі дзярж. ун-т, філіял Бранскага дзярж. ун-та ў г. Навазыбкаве, Пяцігорскі дзярж. лінгв. ун-т, Днепрапятроўскі ун-т эканомікі і права, Валынскі нац. ун-т імя Лесі Украінкі, Данецкі нац. ун-т, Львоўскі нац. ун-т імя І. Франка, Акадэмія Падляска ў Седльцах і інш.

Вынікі работы канферэнцыі былі падведзены на пасяджэнні круглага стала. Прыняты наступныя прапановы:

1. Прызнаць навуковую актуальнасць і значнасць заяўленых для абмеркавання праблем, пра што пераканальна гаварылі ўдзельнікі канферэнцыі.

2. Адзначыць дастаткова высокі ўзровень канферэнцыі, а таксама шырокі спектр праблематыкі, прапанаванай для навуковага асэнсавання.

3. Наступныя падобныя навуковыя канферэнцыі ў межах заяўленай праблемы праводзіць калектывам кафедры беларускага мовазнаўства з пэўнай перыядычнасцю – раз у два-тры гады.

4. Адзначыць змястоўнасць і разнастайнасць культурнай праграмы канферэнцыі.

*В. В. Шур,*
*загадчык кафедры беларускага мовазнаўства,*
*доктар філалагічных навук, прафесар*

МГПУ им. И.П. Шамякина